*А. А. Лукашанец, доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ФАКТАР НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АДМЕТНАСЦІ НАРОДА І КРАІНЫ

1. У сучасным дынамічным шматмоўным і шматкультурным свеце, калі дзякуючы сучасным сродкам камунікацыі фактычна сціраюцца межы паміж краінамі і народамі, праблема захавання нацыянальнай адметнасці і нацыянальнай ідэнтычнасці набывае асаблівую вастрыню і актуальнасць. Зразумела, што гэтае пытанне хвалюе «малыя» і «вялікія» народы, «малыя» і «вялікія» культуры, таму што сучасная цывілізацыя складаецца з вялікай колькасці нацыянальных культур, кожная з якіх мае сваю адметнасць і сваю непаўторную каштоўнасць. Невыпадкова таму праблема захавання і развіцця нацыянальных культур, нацыянальных моў, нацыянальных літаратур, духоўнай спадчыны народаў сёння набывае глабальнае значэнне.

У пачатку XXI ст. праблема захавання нацыянальнай адметнасці для розных народаў стаіць па-рознаму. Гэта абумоўлена і асаблівасцямі гістарычнага развіцця, і ступенню інтэграванасці нацыянальнай культуры і гісторыі ў сусветную культуру і гістарычны працэс, значнасцю і месцам той ці іншай нацыянальнай культуры ў сусветнай супольнасці, роляй пэўнай культуры ў сусветным цывілізацыйным працэсе.

Для беларускага народа, які прайшоў складаную і часам драматычную гісторыю нацыянальнага развіцця, названая праблема набывае асаблівую актуальнасць у пачатку XXI ст. Гэта абумоўлена цэлым шэрагам фактараў. Па-першае, геапалітычнае становішча Беларусі на перакрыжаванні важнейшых еўрапейскіх шляхоў, становішча паміж еўрапейскай і азіяцкай цывілізацыямі абумовіла шырокі спектр культурна-моўных узаемадзеянняў і ўплываў. Па-другое, асаблівасці існавання беларускага этнасу ў складзе шматмоўнай, шматэтнічнай і шматкультурнай сярэдневяковай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага дазволілі беларусам не толькі захаваць і развіць свае арыгінальныя мову, культуру, традыцыі, сфарміраваць уласнае светабачанне, арыгінальны менталітэт і нацыянальна адметную карціну свету, але выпрацаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачуццё павагі і талерантнасці да іншых культур, моў і традыцый. Па-трэцяе, беларуская нацыя фарміравалася, развівала і сцвярджала сваю нацыянальную свядомасць, стварала і ўмацоўвала сваю нацыянальную мову, літаратуру і культуру ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя, поліэтнічнасці і полікультурнасці. Апошняе абумоўлівае шырокі дыяпазон культурнай прасторы беларускага народа, адкрытасць да іншых нацыянальных культур і спецыфічнае размеркаванне нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў гэтай прасторы. Нарэшце, яшчэ адной асаблівасцю нацыянальнай свядомасці і нацыянальнага менталітэту беларускага народа ў сучаснасці з'яўляецца яго поліканфесіянальнасць і рэлігійная цярпімасць. Усё гэта абумоўлівае як важнасць, так і спецыфіку праблемы захавання нацыянальнай адметнасці беларусаў у сучасных умовах глабалізацыі і інтэграцыі.

У сувязі з гэтым неабходна вызначыць тыя фактары грамадскага жыцця нашай краіны, якія садзейнічаюць захаванню і падтрыманню нацыянальнай адметнасці. Для нашай рэчаіснасці гэта, безумоўна, нацыянальная мова, нацыянальная культура і літаратура, народныя традыцыі, асаблівасці менталітэту і светабачання. Акрамя таго, на працягу сваёй шматвяковай гісторыі беларусы як нацыя выпрацавалі ў сабе высокую ступень самазахавальнасці, уменне жыць у згодзе і гармоніі з акаляючым прыродным асяроддзем і ў розных жыццёвых абставінах абапірацца на саміх сябе і ўласную працу.

1.1. Выключна важная роля беларускай мовы ў захаванні і падтрыманні нацыянальнай адметнасці абумоўлена тым, што мова з'яўляецца важнейшай часткай нацыянальнай духоўнай культуры і захавальніцай гістарычнага вопыту народа, прайшла працяглы шлях свайго гістарычнага развіцця, была важнейшым фактарам фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў у XIX – пачатку XX ст., адыграла выключную ролю ў фарміраванні беларускай дзяржаўнасці. Сёння, нягледзячы на складанасці свайго функцыянавання ў грамадстве як сродку зносін, беларуская мова займае значнае месца ў камунікатыўнай і культурнай прасторы беларусаў, з'яўляецца важным сродкам нацыянальнай свядомасці і нацыянальнай ідэнтыфікацыі, сродкам стварэння нацыянальна адметнага іміджу краіны ў свеце. Таму менавіта захаванне нацыянальнай мовы, яе пашырэнне ў найбольш важныя і сучасныя сферы камунікацыі (дзяржаўнае кіраванне, адукацыя і навука, сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт-камунікацыя, канфесіянальная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць і інш.) з’яўляецца адным з найбольш важных і важкіх складнікаў нацыянальнай адметнасці.

1.2. Другім фактарам, які непасрэдна ўплывае на захаванне нацыянальнай адметнасці, трэба лічыць фактар нацыянальна-культурнай кампетэнцыі грамадства. У нашай рэчаіснасці надзвычай важным у гэтых адносінах з’яўляецца веданне сваёй нацыянальнай гісторыі і культуры, народных традыцый і духоўнай культуры беларусаў. На працягу сваёй гісторыі беларускі народ стварыў велізарнейшыя культурныя каштоўнасці, якія складаюць важную частку сусветнай духоўнай культуры. Беларусы далі свету вялікую колькасць славутых вучоных, грамадскіх і палітычных дзеячаў, пісьменнікаў і паэтаў, якія ўнеслі істотны ўклад у развіццё сусветнай навукі і культуры і якімі ганарацца многія народы свету. Таму трэба не толькі ведаць сваю гісторыю і культуру, але і навучыцца ганарыцца сваім мінулым і сучасным.

1.3. Важным фактарам падтрымання нацыянальнай свядомасці трэба прызнаць таксама ўмацаванне нашай незалежнасці і дзяржаўнасці, уваходжанне Беларусі ў еўрапейскую і сусветную супольнасць з выразным нацыянальным абліччам. Адным з важнейшых дзяржаўных прыярытэтаў нашай дзяржаўнай палітыкі і сістэмы адукацыі ў гэтых адносінах, безумоўна, павінна стаць фарміраванне высокаразвітай, усебакова адукаванай асобы, якая добра ўсведамляе нацыянальныя прыярытэты і каштоўнасці, клапатліва адносіцца да ўласнай гісторыі і культуры, з’яўляецца найбольш падрыхтаванай да плённай дзейнасці ў сучасным дынамічным і шматкультурным свеце.

1.4. Нарэшце, магчыма, найбольш істотным фактарам, які набывае асаблівую актуальнасць у XXI ст., з’яўляецца разуменне дзяржавай і грамадствам гуманітарнага складніка развіцця цывілізацыі. У сучасным грамадстве, калі інтэнсіўнае развіццё атрымліваюць высокія тэхналогіі, гуманітарныя навукі набываюць асаблівае значэнне і, па сутнасці, становяцца самастойнай вытворчай сілай. Толькі гуманітарны складнік у сучаснай навуцы, асэнсаванне месца і ролі творчай, інтэлектуальна развітой асобы дазволяць чалавеку застацца ў цэнтры цывілізацыйнага развіцця, а не ператварыцца ў прыдатак навукова-тэхнічнага прагрэсу. Таму праблема захавання нацыянальнай адметнасці народа і гуманізацыі жыцця грамадства павінна вырашацца сумеснымі сіламі дзяржавы і грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1.5. Яшчэ адзін аспект праблемы захавання нацыянальнай адметнасці датычыцца, на наш погляд, спецыфікі рэалій нацыянальна-культурнага жыцця сучаснай Беларусі. Тут варта гаварыць пра такія два істотныя аспекты, як адкрытасць і этнацэнтрызм.

У сучасным дынамічным свеце захаваць нацыянальную адметнасць можна толькі ў кантэксце сусветнага цывілізацыйнага развіцця. Гэта значыць, што развіццё нацыянальных моў, культур, літаратур і ўсяго таго, што садзейнічае захаванню нацыянальнай адметнасці народа, магчыма толькі ў кантэксце развіцця моў, літаратур і культур іншых народаў. Таму вывучэнне і веданне нацыянальных каштоўнасцей іншых народаў будзе садзейнічаць усведамленню каштоўнасці і значнасці ўласнанацыянальных духоўных і культурных каштоўнасцей. Нацыянальна-культурная ізаляцыя сёння ўяўляе тупіковы шлях духоўнага развіцця грамадства

Акрамя таго, сёння ў беларускім грамадстве існуе неабходнасць змены прыярытэтаў нацыянальна-культурнага развіцця. Менавіта нацыянальныя мова, літаратура, культура і іншыя духоўныя каштоўнасці павінны фарміраваць ядро культурнага поля грамадства, якое дапаўняецца, пашыраецца і ўзбагачаецца веданнем моў, літаратур і культур іншых народаў.

Як уяўляецца, рэалізацыя адзначаных падыходаў да нацыянальна-культурных аспектаў духоўнага жыцця беларускага грамадства дазволіць не толькі захаваць нашу культурную і гістарычную спадчыну, але і нацыянальную адметнасць у бязмежнай разнастайнасці сучаснага свету. Таму словы класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, напісаныя на пачатку XX ст., «Жыў беларус і будзе жыць!» захоўваюць сваю актуальнасць і на пачатку XXI ст.

2. Выключная роля любой нацыянальнай мовы, у тым ліку і беларускай, як сродку захавання і падтрымання нацыянальнай адметнасці народа грунтуецца, на нашу думку, перш за ўсё на наступных пастулатах.

2.1. Трэба адрозніваць знешні і ўнутраны аспекты моўнай адметнасці і ідэнтыфікацыі. Пра знешнюю ідэнтыфікацыю (а значыць, і адметнасць) варта гаварыць тады, калі па мове індывіда адносяць да той ці іншай нацыянальнасці, да таго ці іншага этнасу, да той ці іншай культуры, да той ці іншай сацыяльнай групоўкі. Іншымі словамі, знешняя ідэнтыфікацыя звязана з ацэнкай моўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паводзін індывіда іншымі індывідамі. Унутраная ідэнтыфікацыя (самаідэнтыфікацыя) – гэта патрэбнасць самой асобы (індывіда) праз адносіны да мовы атаясамліваць сябе з той ці іншай культурай, той ці іншай нацыяй. Знешняя ідэнтыфікацыя, як можна меркаваць, патрабуе актыўнага карыстання мовай, гэта значыць прадугледжвае наяўнасць адпаведнай моўнай кампетэнцыі. Унутраная ідэнтыфікацыя не абавязкова звязана з актыўным выкарыстаннем мовы ў якасці сродку камунікацыі. Тут галоўным з'яўляецца дэкларатыўны аспект.

2.2. Мова з'яўляецца важным, але не адзіным (і, магчыма, не галоўным) фактарам нацыянальнай адметнасці і ідэнтыфікацыі. Параўн.: «...Пэўны тып матэрыяльнай і духоўнай культуры не абавязкова адпавядае пэўнаму тыпу мовы. Больш таго, носьбіты адной мовы могуць адносіцца да розных культур, і наадварот, прадстаўнікі адной культуры могуць быць носьбітамі розных моў... Нават носьбіты адной мовы могуць быць этнаграфічна далёкімі (напрыклад, дняпроўскія і карпацкія ўкраінцы). З другога боку, у сучасным свеце існуюць культурныя супольнасці разнамоўных народаў. Так, шмат агульнага маюць балканскія народы (балгары, грэкі, албанцы), палякі і літоўцы. Дэкларатыўны тэзіс аб тым, што кожная нацыя мае свае ўзаемазвязаныя культуру і мову, не адпавядае рэчаіснасці. Агульнавядома, што большасць сучасных нацый, якія маюць арыгінальную культуру, карыстаюцца мовамі, што ўзніклі ва ўлонні чужых этнасаў»[1]. Толькі ў пэўных умовах, у сукупнасці розных абставін гістарычнага і культурнага развіцця мова можа прэтэндаваць на ролю вядучага (галоўнага) фактару нацыянальнай адметнасці.

2.3. Роля мовы як фактару нацыянальнай ідэнтыфікацыі залежыць ад статусу самой мовы і ступені яе распаўсюджанасці. Фактычна міжнародныя мовы-макрапасрэднікі страчваюць функцыю нацыянальнай ідэнтыфікацыі і пачынаюць выконваць ролю міжнацыянальнай інтэграцыі. Так, у сучасным свеце англійская мова не дазваляе адназначна ідэнтыфікаваць яе носьбіта з яго нацыянальнай прыналежнасцю. Гэтак жа сама і руская мова на постсавецкай прасторы, з'яўляючыся перш за ўсё нацыянальнай мовай рускіх, таксама выконвае функцыю міжнацыянальнай інтэграцыі і не можа служыць маркерам нацыянальнай прыналежнасці.

---

[1] *Мартынаў, В.У.* Мова і культура. Некаторыя разважанні // Беларуская лінгвістыка. – Мінск, 1989. – Вып. 36. – С. 12–13.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2.4. Значнасць натуральнай мовы для нацыянальнай ідэнтыфікацыі яе носьбітаў цесна звязана з наяўнасцю агульналітаратурнага стандарту. Пісьмовая літаратурная мова мае значна большыя ідэнтыфікацыйныя магчымасці ў параўнанні з бяспісьменнымі мовамі, што выкарыстоўваюцца толькі ў вусных зносінах.

2.5. Наяўнасць разнавіднасцей нацыянальнай мовы. У гэтым выпадку кожная разнавіднасць нацыянальнай мовы выконвае ідэнтыфікацыйныя функцыі featнага ўзроўню: літаратурная мова забяспечвае ўзровень нацыянальнай ідэнтыфікацыі, мясцовыя гаворкі – узровень лакальнай ідэнтыфікацыі (і адначасова дыферэнцыяцыі), сацыяльныя разнавіднасці (жаргоны, слэнг) – узровень карпаратыўнай (групавой) ідэнтыфікацыі і дыферэнцыяцыі пры захаванні агульнанацыянальнай ідэнтыфікацыі і адметнасці.

2.6. Наяўнасць пісьмовых разнавіднасцей літаратурнай мовы. У гэтым выпадку літаратурна-пісьмовыя варыянты мовы могуць адыгрываць ролю групавой і карпаратыўнай інтэграцыі і дыферэнцыяцыі.

2.7. Канкрэтныя экстралінгвістычныя (палітычныя) умовы. Яркім прыкладам гэтага можа служыць моўная сітуацыя Вялікага герцагства Люксембург перыяду нацысцкай акупацыі. Тэндэнцыя да прызнання люксембургскага дыялекту нацыянальнай мовай праявілася ў сярэдзіне XIX ст. Аднак толькі ў 1912 г. люксембургская мова была ўключана ў праграму пачатковай школы, а таксама было прынята рашэнне аб распрацоўцы люксембургскай арфаграфіі. Разам з тым у час правядзення ў 1941 г. перапісу насельніцтва ў графе «родная мова» люксембуржцы аднадушна ўказалі люксембургскую (летцэбургскую) мову, што сведчыць аб яе ролі як фактару нацыянальнага адзінства перад пагрозай гвалтоўнага анямечвання[2].

3. Усе названыя аспекты неабходна ўлічваць і пры ацэнцы ролі беларускай мовы – дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь і мовы тытульнай нацыі – як рэальнага сродку камунікацыі і фактару захавання і падтрымання нацыянальнай адметнасці беларусаў у сучасным свеце. Гістарычныя абставіны і сучасныя ўмовы нацыянальна-культурнага развіцця краіны дазваляюць гаварыць пра тое, што менавіта беларуская мова была і сёння з’яўляецца найбольш важным і відавочным фактарам падтрымання і захавання

[2] Общество – язык – политика. – Минск, 1988. – С. 70–72.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнай адметнасці беларусаў у XXI ст. Разам з тым відавочнымі з’яўляюцца і спецыфічныя асаблівасці гэтай ролі беларускай мовы ў сучасным беларускім грамадстве.

3.1. Асаблівасцямі існавання беларускай мовы ў сучасным соцыуме з’яўляецца, па-першае, тое, што яна па-ранейшаму застаецца толькі адным з кампанентаў моўнай сітуацыі і выконвае свае функцыі, канкурыруючы з другой, больш моцнай у камунікатыўных адносінах, мовай. У прынцыпе, на тэрыторыі нашай краіны няма такога рэгіёна, такога соцыуму, дзе беларуская мова выступала б адзіным сродкам зносін. Разам з тым рэальным фактам сучаснай моўнай сітуацыі з’яўляецца і тое, што кожны грамадзянін нашай краіны, незалежна ад таго, якой мовай ён карыстаецца ў сваёй паўсядзённай дзейнасці, штодзённа сутыкаецца з інфармацыяй на беларускай мове.

3.2. Па-другое, на працягу дастаткова доўгага перыяду беларуская нацыянальная мова не выкарыстоўвалася ў сферах афіцыйнага ўжытку і функцыянавала пераважна ў вуснай разнавіднасці.

3.3. Па-трэцяе, новая беларуская літаратурна-пісьмовая мова складвалася выключна ва ўмовах двухмоўя і нават шматмоўя. Гэтая акалічнасць абумовіла спецыфіку адбору сродкаў агульнанароднай мовы ў якасці літаратурнага стандарту, а таксама агульных падыходаў да нарматворчасці.

3.4. Па-чацвёртае, перапынак пісьмовай традыцыі і адсутнасць пераемнасці са старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовай прадвызначылі народна-гутарковую аснову новай беларускай літаратурнай мовы, што таксама аказала пэўны ўплыў на яе ўваходжанне ў некаторыя сферы ўжытку, такія як, напрыклад, справаводства, вышэйшая адукацыя, навука і г.д. Акрамя таго, менавіта гэтая акалічнасць абумовіла спецыфіку нацыянальнай словатворчасці на пачатку XX ст., у тым ліку ў сферы навуковай тэрміналогіі.

3.5. Нарэшце, на працягу ўсяго XX ст. беларуская мова развівалася, удасканальвалася і функцыянавала выключна ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя. Таму парадоксам усяго этапу існавання і развіцця новай беларускай літаратурнай мовы ў XX ст. з’яўляецца тое, што паралельна з развіццём і ўдасканаленнем сістэмы мовы адбываўся працэс змяншэння колькасці актыўных карыстальнікаў беларускай мовы. У выніку, працэс інтэнсіўнага пашырэння беларускай мовы ў розныя сферы ўжытку ў першай палове XX ст. змяняецца ў другой палове адваротным працэсам яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выцяснення з тых сфер, у якія яна ўвайшла ў папярэдні перыяд. Асабліва моцна гэты працэс закрануў афіцыйныя сферы ўжытку (справаводства, дзяржаўнае кіраванне, СМІ), а таксама сферу навучання, у тым ліку школьнага. Гэта прывяло да таго, што ў канцы
80-х гг. беларуская мова ў цэлым радзе камунікатыўных сфер, якія фарміруюць грамадскі прэстыж любой мовы, была прадстаўлена вельмі абмежавана.

4. У сувязі з тымі працэсамі, якія адбываліся ў канцы XX ст. у сферы моўнага жыцця нашай краіны, неабходна звярнуць увагу на адзін вельмі істотны аспект, які характарызуе месца беларускай мовы ў сучасным грамадстве і яе перспектывы як рэальнага сродку камунікацыі і нацыянальнай адметнасці. Так, асноўным асяроддзем актыўнага выкарыстання беларускай мовы ў 70–80-я гг. мінулага стагоддзя заставалася беларуская вёска, а таксама асяроддзе гарадской гуманітарнай інтэлігенцыі. Дарэчы, і беларускамоўнае навучанне ў сярэдняй школе таксама захоўвала свае пазіцыі пераважна ў сельскай мясцовасці. Таму адным з найбольш істотных вынікаў моўнага развіцця напрыканцы XX ст., калі на працягу невялікага перыяду 90-х гг. рэзка ўзрасла ў грамадстве цікавасць да беларускай мовы, рабіліся інтэнсіўныя захады да пашырэння яе выкарыстання ў самых прэстыжных і запатрабаваных сферах ужытку, быў заканадаўча замацаваны яе статус як дзяржаўнай мовы, трэба лічыць змену грамадскіх ацэнак і сацыяльнай лакалізацыі беларускай мовы. Нягледзячы на тое, што намаганні па пашырэнні беларускай мовы ў асноўныя сферы ўжытку былі непрацяглымі і не далі чакаемых вынікаў, станоўчым, безумоўна, момантам з’яўляецца факт змены ацэнак і адносін грамадства да самой мовы. Сёння беларуская мова ўсведамляецца як важнейшы сродак захавання нацыянальнай адметнасці народа і краіны. У грамадстве ў цэлым сфарміравалася і замацавалася ўсведамленне прэстыжу асобы, якая побач з рускай мовай ведае і беларускую мову і карыстаецца ёю ў сваёй дзейнасці. Сёння сацыяльнай базай беларускай мовы з’яўляецца не вёска і вясковы соцыум, а пераважна гарадское асяроддзе беларускай інтэлектуальнай эліты (не толькі гуманітарнай), прадстаўнікі маладога пакалення грамадзян нашай краіны.

Адметным фактам моўнага развіцця гэтага перыяду з’явілася таксама спецыфічнае пераразмеркаванне функцыянальнай ролі беларускай мовы ў сучасным соцыуме. Так, у выніку змяншэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

колькасці актыўных карыстальнікаў беларускай мовы і яе ролі як рэальнага сродку зносін, істотна ўзрасло яе значэнне як сродку і сімвала нацыянальнай ідэнтыфікацыі і самаідэнтыфікацыі, сродку захавання і прэзентацыі нацыянальнай духоўнай спадчыны і культуры.

Таму сярод найбольш істотных момантаў, якія вызначаюць ролю беларускай мовы як сродку і фактару нацыянальнай адметнасці і ідэнтыфікацыі на пачатку XXI ст., у першую чаргу трэба назваць наступныя.

4.1. Месца і статус беларускай мовы ў сучаснай моўнай сітуацыі.

Сапраўды, беларуская мова сёння з’яўляецца толькі адным з кампанентаў моўнай сітуацыі, адной з дзяржаўных моў краіны, адным са сродкаў камунікацыі ў двухмоўным соцыуме. Нягледзячы на тое, што гэта адна з пашыраных пісьмовых моў свету, яна на працягу ўсяго XX ст. развівала і ўдасканальвала сваю сістэму выключна ва ўмовах блізкароднаснага двухмоўя, што істотна паўплывала як на яе месца ў камунікатыўнай прасторы беларускага соцыуму, так і на асаблівасці яе літаратурных норм, паколькі заўсёды захоўвала актуальнасць пурыстычная тэндэнцыя захавання і павелічэння нацыянальнай адметнасці і спецыфікі самой сістэмы мовы. А гэта, як можна меркаваць, спецыфічна адбіваецца і на яе ролі як фактару нацыянальнай адметнасці носьбітаў.

Акрамя таго, сам факт дзяржаўнага двухмоўя і існуючая неабходнасць пашырэння беларускай мовы ў афіцыйныя сферы ўжытку ставяць на парадак дня праблему цывілізаванага разумення сутнасці дзяржаўнага двухмоўя і неабходнасць строгага выканання дзяржаўнага заканадаўства ў моўнай сферы. Сапраўды, з аднаго боку, дзяржаўнае двухмоўе дае грамадзяніну права карыстацца любой дзяржаўнай мовай. Аднак, з другога боку, гэтае ж дзяржаўнае двухмоўе прадугледжвае і тое, што дзяржава павінна рэальна забяспечыць гэтае права любому грамадзяніну ва ўсіх сферах жыцця сучаснага грамадства. А гэта ўжо азначае, што кожны дзяржаўны служачы як прадстаўнік менавіта дзяржавы павінен дасканала валодаць абедзвюма дзяржаўнымі мовамі. Толькі ў такім выпадку можна дасягнуць парытэтнага выкарыстання абедзвюх дзяржаўных моў ва ўсіх сферах афіцыйнага ўжытку і забяспечыць беларускай мове той грамадскі статус і прэстыж, які яна павінна мець як дзяржаўная мова краіны і мова тытульнай нацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4.2. Узровень развіцця сістэмы мовы і яе месца ў камунікатыўнай прасторы.

Для таго, каб паспяхова выконваць функцыі дзяржаўнай мовы і забяспечваць патрэбы афіцыйных сфер зносін, быць рэальным сродкам захавання нацыянальнай адметнасці народа, любая мова, у тым ліку і беларуская, павінна адпавядаць пэўнаму ўзроўню развіцця сваёй сістэмы, валодаць адпаведным лексічным запасам, мець дастатковую навуковую тэрміналогію, строгія і стабільныя літаратурныя нормы, трывалую пісьмовую традыцыю і г.д. Таму аб'ектыўнымі фактарамі для пашырэння і паспяховага функцыянавання беларускай мовы як дзяржаўнай у важнейшых сферах афіцыйнага ўжытку на пачатку XXI ст. з'яўляюцца наступныя.

4.2.1. Нягледзячы на відавочныя праблемы выкарыстання беларускай мовы ў якасці рэальнага сродку камунікацыі, трэба прызнаць відавочным фактам тое, што сістэма нацыянальнай беларускай мовы ў камунікатыўнай і культурнай прасторы сучаснага грамадства прадстаўлена некалькімі разнавіднасцямі (падсістэмамі), якія па-рознаму запатрабаваны ў розных сферах ужытку і маюць розную сацыяльную стратыфікацыю. Сёння беларускамоўную прастору фарміруюць не толькі літаратурная мова як вышэйшая разнавіднасць нацыянальнай мовы, але і такія ям падсістэмы, як народныя гаворкі, сацыяльныя дыялекты, "тарашкевіца" і нават беларуская трасянка (тая частка змешанага вуснага маўлення, якое можа быць ахарактарызавана як беларускамоўнае маўленне з элементамі рускай мовы).

4.2.2. Менавіта **беларуская літаратурная мова** (літаратурны стандарт) як вышэйшая і прадстаўнічая форма існавання нацыянальнай мовы, якая характарызуецца агульнанацыянальнай значнасцю, поліфункцыянальнасцю і разнастайнасцю пісьмовых і вусных жанраў, абслугоўвае ўсе сферы дзейнасці носьбітаў гэтай мовы, фарміруе яе прэстыжнасць і камунікатыўную запатрабаванасць у грамадстве. Сёння беларуская мова з'яўляецца адной з высокаразвітых літаратурных моў свету. Яе літаратурныя нормы замацаваны ў разнастайных лексікаграфічных даведніках, граматыках і іншых фундаментальных працах, большасць з якіх падрыхтаваны ў Інстытуце мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, які застаецца практычна адзінай навукова-даследчай установай у краіне, дзе праводзяцца планамерныя даследаванні ў галіне беларускага мовазнаўства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нарматыўную базу беларускай мовы складаюць «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» ў 5 тамах, 6 кнігах (Мінск, 1977–1984), «Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы» (Мінск, 1994; 3-е выд. – Мінск, 2002), акадэмічныя «Граматыка беларускай мовы» ў 2 тамах (Мінск, 1962–1964) і «Беларуская граматыка» ў 2 частках (Мінск, 1985–1986), нарматыўны «Слоўнік беларускай мовы» (Мінск, 1987), Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі», а таксама разнастайныя энцыклапедычныя, двухмоўныя і тэрміналагічныя слоўнікі. Дарэчы, гэтыя і іншыя фундаментальныя працы, падрыхтаваныя ў акадэмічным Інстытуце мовы і літаратуры, не толькі забяспечылі беларускай мове статус адной з найбольш даследаваных славянскіх моў, але і высокі прэстыж акадэмічнага мовазнаўства ў славянскім свеце.

Сёння беларуская мова – гэта поўнафункцыянальная мова, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства. Аднак асаблівасці сучаснага становішча беларускай мовы ў тым, што ў многіх традыцыйных сферах яна прысутнічае толькі сімвалічна, і асноўная задача заключаецца ў рэальным пашырэнні беларускай мовы ва ўсе сферы ўжытку, дзе яна павінна выкарыстоўвацца як дзяржаўная мова нашай краіны і мова тытульнай нацыі. Разам з тым вельмі важным з’яўляецца ўсведамленне таго факта, што беларускай мове не трэба даказваць магчымасць выкарыстання ў любой сферы зносін жыцця сучаснага грамадства. Літаратурная разнавіднасць беларускай мовы як мовы дзяржаўнай тэарэтычна не мае функцыянальных і сацыяльных абмежаванняў. Яна дастаткова шырока выкарыстоўваецца ў многіх камунікатыўных сферах, такіх як школьнае навучанне, СМІ, мастацкая творчасць і інш., і ў той ці іншай ступені прысутнічае ў астатніх.

Трэба адзначыць, што, нягледзячы на відавочныя праблемы выкарыстання беларускай мовы ў многіх «традыцыйных» сферах ужытку, сёння беларуская мова дастаткова інтэнсіўна пранікае ў такія сучасныя і актуальныя для духоўнага і інтэлектуальнага жыцця беларускага грамадства сферы, як СМС- і інтэрнэт-камунікацыя, канфесіянальная сфера і г.д.

Такім чынам, беларуская мова пачатку XXI ст. – гэта мова, якая а) функцыянуе ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях; б) прадстаўлена некалькімі падсістэмамі, што па-рознаму запатрабаваны ў розных сферах ужытку; в) інтэнсіўна развіваецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плане павелічэння сваіх разнавіднасцей і пашырэння слоўнікавага складу; г) «заваёўвае» новыя сучасныя сферы дзейнасці грамадства.

4.2.3. Развіццё сістэмы беларускай мовы ў пачатку XXI ст. характарызуецца складанасцю, супярэчлівасцю і дынамізмам працэсаў, а яе месца ў камунікатыўнай прасторы – другарадным становішчам у большасці сфер зносін. Разам з тым сучасны стан беларускай мовы ў грамадстве, слоўнікавы склад і высокія адаптацыйныя магчымасці, заканадаўчы статус і месца ў сістэме адукацыі і СМІ, шырокая сацыяльная база даюць падставы меркаваць, што і ў XXI ст. яна застанецца рэальным сродкам зносін, нацыянальнай ідэнтыфікацыі і культуры беларусаў, а таксама захавае сваё месца сярод славянскіх моў і ў моўным ландшафце Еўропы.

5. З улікам існуючай моўнай сітуацыі і рэалій блізкароднаснага двухмоўя дзейнасць па пашырэнні беларускай мовы як дзяржаўнай мовы краіны ва ўсе важнейшыя сферы грамадскага ўжытку, найперш афіцыйнага, павышэнні яе ролі як сродку захавання і падтрымання нацыянальнай адметнасці, практычная рэалізацыя прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў нашай краіне павінны ўлічваць наступныя моманты.

5.1. З сітуацыяй двухмоўя заўсёды звязаны праблемы паўнавартаснага і парытэтнага выкарыстання суіснуючых моў ва ўсіх сферах грамадскіх зносін, аднак заканадаўча замацаванае дзяржаўнае двухмоўе пры безумоўным выкананні моўнага заканадаўства дае пэўныя гарантыі для рэальнай падтрымкі раўнапраўнага функцыянавання абедзвюх дзяржаўных моў у гэтых сферах.

5.2. Рэаліі сучаснага моўнага жыцця ў Рэспубліцы Беларусь сведчаць, што блізкароднаснае двухмоўе застанецца вызначальным фактарам гэтай сферы жыцця беларускага грамадства ў XXI ст. Таму задачы пашырэння беларускай мовы ў важнейшыя сферы ўжытку ў бліжэйшай перспектыве павінны ставіць сваёй мэтай дасягненне парытэтнага выкарыстання абедзвюх дзяржаўных моў (беларускай і рускай).

5.3. Сучасная беларуская мова па ўзроўні развіцця сваёй сістэмы, слоўнікавага складу, навуковай тэрміналогіі здольна паспяхова абслугоўваць усе сферы ўнутрынацыянальных зносін. Актуальнай з’яўляецца задача яе рэальнага пашырэння ў найбольш важныя і ўплывовыя сферы ўжытку, што патрабуе адпаведнай дзяржаўнай падтрымкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.4. На пачатку XXI ст. беларуская мова рэальна запатрабавана ў камунікатыўнай прасторы беларускага грамадства, актыўна выкарыстоўваецца ў радзе традыцыйных сфер ужытку і адначасова выяўляе тэндэнцыю да пашырэння ў новыя сучасныя сферы камунікацыі. Актуальнай з'яўляецца праблема пашырэння выкарыстання беларускай мовы менавіта ў такія традыцыйныя сферы ўжытку, як дзяржаўнае кіраванне, справаводства, школьнае навучанне, СМІ і г.д. Для рэалізацыі гэтага неабходна выкананне комплексу практычных мерапрыемстваў у межах існуючага моўнага заканадаўства.

5.5. Рэальнае пашырэнне беларускай мовы ў тыя сферы, дзе яна павінна выкарыстоўвацца як дзяржаўная, немагчыма без адпаведнай навуковай базы. Гэта абумоўлівае актуальнасць правядзення сістэмных і сістэматычных даследаванняў у галіне беларускага мовазнаўства, падрыхтоўкі разнастайных даведнікаў для забеспячэння патрэб вуснай і пісьмовай практыкі.

5.6. Неабходна мэтанакіраванае фарміраванне моўнай кампетэнцыі грамадства і прававой кампетэнцыі грамадзян у сферы моўнага жыцця. Важнай задачай дзяржаўнай нацыянальнай ідэалогіі павінна стаць захаванне і ўзмацненне нацыянальна-культурных прыярытэтаў, што адпавядае сучасным тэндэнцыям сусветнага гуманітарна-цывілізацыйнага працэсу. Неабходна фарміраваць грамадскае ўсведамленне, што толькі рэальна двухмоўная і шматмоўная асоба, якая выразна ўсведамляе каштоўнасць нацыянальна-моўных прыярытэтаў для захавання сваёй адметнасці ў эпоху інтэнсіўнай глабалізацыі і інтэграцыі, з'яўляецца найбольш падрыхтаванай для рэалізацыі сваіх інтэлектуальных здольнасцей і прафесійных амбіцый у сучасным шматмоўным і шматкультурным свеце.

На працягу мінулага стагоддзя беларуская мова даказала сваю жыццёвасць, значэнне для беларускага грамадства, заняла належнае месца сярод славянскіх моў і на лінгвістычнай карце Еўропы, а беларусістыка стала важнай часткай лінгвістычнай славістыкі. Таму сёння на пачатку XXI ст. актуальнасць набывае пэўная карэкціроўка вектару развіцця сістэмы беларускай мовы і агульнай ідэалогіі развіцця беларусістыкі і працэсу навучання беларускай мове.

Па-першае, беларуская мова павінна пазбавіцца ад комплексу блізкароднаснага адштурхоўвання. Моўны пурызм як самамэта на сучасным этапе рэальна стрымлівае развіццё мовы і яе паўнацэннае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанне ў найбольш важных і актуальных для жыцця сучаснага грамадства камунікатыўных сферах.

Па-другое, сама беларусістыка і працэс выкладання беларускай мовы павінны стаць выразна этнацэнтрычнымі, павінны пазбавіцца свядомага ці падсвядомага параўнання з сістэмамі іншых блізкароднасных моў, акцэнтавання ўвагі на спецыфічна адметных рысах сістэмы беларускай мовы.

Па-трэцяе, прэстыж мовы фарміруецца ў значнай меры аўтарытэтам яе носьбітаў. Таму прапагандаваць беларускую мову ўласным прыкладам сёння павінны людзі паважаныя, аўтарытэтныя і паспяховыя.

Усё гэта, як уяўляецца, дазволіць беларускай мове захаваць і ўзмацніць сваю ролю як фактару захавання і падтрымання нацыянальнай адметнасці беларусаў у XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ